

Ніва

БЕЛАРУСКІ ТЫДНЁВІК

№ 48 (927) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 2 СНЕЖНЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.

БГКТ ХРОНІКА

■ На Гайнаўшчыне пасьпяхова праходзіць справаздачная кампанія ў гуртках БГКТ. Для многіх гурткоў гэта справаздачна-выбарная кампанія, таму што за два мінулыя гады многія члены праўленняў выехалі са сваіх вёсак і неабходна было правесці выбары новых праўленняў. І так, у апошні час справаздачна-выбарныя сходы адбыліся ў Махнатым, Чарэмсе-вёсцы і Клейніках. Усюды пасля справаздачнага даклада адбылася творчая дыскусія, на аснове якой былі выпрацаваны далейшыя напрамкі дзейнасці, зацверджаны планы працы і выбраны новыя праўленні, у склад якіх увайшлі:

У Махнатым — Анна Білеўская (старшыня), Янка Кот, Клаўдзія Кот, Уладзімір Матвеюк, Галіна Кот і Ірэна Грыгарук. (Усе 45 членаў гуртка аплацілі членскія складчыны за гэты год).

У Чарэмсе-вёсцы трыццаціасабовы гурток узначаліў Янка Шатыловіч, а ў праўленне выбраны Галіна Кердэлевіч, Ліда Раманюк, Юрка Шатыловіч і Яўгенія Унучко. Гурток БГКТ арганізуе тэатральны калектыў, які прыме ўдзел у конкурсе БГКТ.

У Клейніках у склад праўлення ўвайшлі: Янка Лабузінскі (старшыня), Надзя Аўласюк і Аляксей Іванюк.

■ Нядаўна ў клубе гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку адбылася аўтарская сустрэча Сакрата Яновіча, які чытаў свае новыя творы і адказваў на шматлікія пытанні прысутных. Многія з удзельнікаў сустрэчы мелі магчымасць купіць кніжку аўтара „Загоны".

■ 17 лістапада ў клубе БГКТ у Беластоку адбылася сустрэча з пісьменнікам Янам Гушчам.

■ Пад мастацкім кіраўніцтвам Аляксандра Лукашука (дырыжор) і Янкі Крупы (харэограф) 17 лістапада ў памяшканні ГП БГКТ у Беластоку выступіў з канцэртам беларускі калектыў песні і танца БГКТ „Белавежа" з Белавежы.

■ Жаночы харавы калектыў БГКТ з Гарадка, якім кіруе Сцяпан Копа, 18 лістапада выязджаў з канцэртам у Крынкі, што на Сакольшчыне.

■ На нарадзе старшынь гурткоў БГКТ Беластоцкага павету, якая адбылася 18 лістапада ў Беластоку, старшыня аддзела Янка Цялушэцкі паінфармаваў аб працы прэзідыума і праўлення аддзела і аб заданнях справаздачнай кампаніі, якая распачалася ў БГКТ. Сакратар аддзела Геня Іванюк пазнаёміла старшынь гурткоў з правіламі песеннага конкурсу і конкурсу тэатральных калектываў, якія адбудуцца ў 1974 годзе, але да якіх неабходна ўжо цяпер пачаць рыхтавацца.

■ 18 лістапада гарадскі аддзел БГКТ у Беластоку арганізаваў сустрэчу з Уладзімірам Паўлючуком — аўтарам кніжкі „Светапогляд адзінкі ва ўмовах распаду традыцыйнага грамадства". (мх)



У Ляўкове прыбывае мураваных дамоў.

ЛЯЎКОВА-ВЁСКА ПРАМЫСЛОВАЯ


Усё больш чутна на Гайнаўшчыне ды не толькі на Гайнаўшчыне пра Ляўкова. Вёска гэтая знаходзіцца ў паўночна-ўсходняй частцы павету. Жывапісная тут ваколіца. Вёска на невялічкім узгорачку. Абступаюць яе палі, а з поўдня і захаду сенажаці, рака Нараўка, ды дрымучы сасновы бор. Усё больш экскурсій і турыстаў пачынае наведваць Ляўкова і яго наваколле. А была б яшчэ асфальтная дарога з Гайнаўкі (пакуль што Ляўкова з горадам спалучае разбіты грузавымі машынамі брук) і некалькі пляцін на рэчцы! Аднак і цяпер ужо многія гараджане ахвотна прыязджаюць адпачываць на Нараўку.

Гэта не ўсе тыя дары прыроды, якімі багата ляўкоўская ваколіца. У 1970 годзе на багатых рэсурсах высокаякаснай гліны пачынае прадукцыю керамічная фабрыка. Спачатку выпускала яна 18 мільёнаў керамічных адзінак у год, а зараз у тры разы больш. Хваляць будаўнікі ляўкоўскую цэглу К-2 і У-25/20 і дрэнацыйныя трубкі. Цэгла ідзе нават на экспарт. Мільёны штук. На фабрыцы працуе больш 320 асоб, у тым ліку адна трэцяя — гэта жыхары Ляўкова. З некаторых ляўкоўскіх сем'яў працуе па некалькі асоб. Найбольш маладых людзей. Многія з іх нават пазнаёміліся на фабрыцы, пажаніліся. Яны маюць добра платную працу, а некаторыя сем'і ўжо і кватэры ў блоках. Для многіх адкрываюцца шырокія магчымасці будаваць уласныя дамы. Дык і растуць яны, як грыбы пасля дажджу. Налічыць можна іх каля двух дзесяткаў, усе снежнабелыя, з вялікімі вокнамі і прыгожымі ганачкамі. Не менш ёсць і мураваных сельскагаспадарчых будынкаў, паколькі ляўкоўцы пакрысе гаспадараць і на зямлі. Праз вёску і да чыгуначнага вакзала пракладзены навюсенькі роўны брук. Гаспадары задбалі аб агародах. Некаторыя маюць нават жалезныя брамы і веснічкі.

Будучыня Ляўкова цікавая і шматабяцаючая. Мо нават побач з керамічнай фабрыкай будзе пабудавана гута шкла. Аказваецца, што ёсць і да гэтага роду прамысловасці патрэбная сыравіна. Ужо вядома, што будзе тут цэнтр здароўя, святліца з кіназалам, новая школа. Вырастуць новыя блокі. Ужо зараз бліжэй да фабрыкі перабралася паштовая ўстанова. Ляўкова атрымала новыя гандлёвыя павільёны. Ёсць бібліятэка, спулдзельня здароўя і невялікая святліца.

Хочацца верыць, што мары пра будучыню Ляўкова як вёскі высокапрамысловай напэўна здзейсняцца.

Тэкст і фота **Я. Цялушэцкага**



Ляўкоўская керамічная.

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У "Ніве"

Размова з Мікалаем Самоцікам — старшынёй ГП БГКТ ● Пра жніво на Гайнаўшчыне ● Вечар з Янам Гушчам ● Лён, ты мой лён... ● Гапка адкрывае Барскага ● Сустрэчы з кандыдатамі ў рады народныя ● Дом для васьміасабовай сям'і (будаўнічыя парады) ● Весткі з Чыжоў, Трасцянкі, Варшавы, Ягаднік, Спічкаў, Міхалова, Дубіч Царкоўных, Старога Корніна і інш... ● Песня Мама моя"

1 МІЛЬЁН І 45 ТЫСЯЧ



Беласточчына ў найбліжэйшыя два гады павінна давесці стан быдла да мільёна штук. Дык неабходна інтэнсіфікаваць жывёлагадоўчую прадукцыю.

Мы пацікавіліся, як гэта справа выглядае ў Гайнаўскім павеце.

— Да ваяводскага мільёна, — сказаў нам сакратар па сельскагаспадарчых справах павятовага камітэта партыі ў Гайнаўцы тав. Рышард Дваракоўскі, — **дакладаем ад сябе 45 тысяч штук рагатай жывёліны.**

Многа гэта ці мала?

У залежнасці ад таго, з якога боку паглядзець на справу. Цяпер у хлявах гаспадароў на Гайнаўшчыне знаходзіцца больш-менш 32 тысячы кароў і цялят. Такі вынік даў апошні чэрвеньскі сельскагаспадарчы перапіс. Значыць, да 45 тысяч не хапае яшчэ каля 12—13 тысяч штук. Адначасова ўстаноўлена было, што на працягу 1972 года рагаты статак Гайнаўскага павету павялічыўся на 2200 штук. Калі б устанавіўся толькі такі гадавы прырост у жывёлагадоўлі Гайнаўскага павету, патрэбна было б аж 5—6 гадоў на тое, каб атрымаць гэтыя 45 тысяч штук жывёлы. Такі прагрэс нікога цяпер не задавальняе. Ён несумяшчальны з агульнапольскім сучасным тэмпам развіцця нацыянальнай гаспадаркі.

— Мы гэта дасканала разумеем, — сцвярджае сакратар Дваракоўскі, — і таму пры кожнай нагодзе тлумачым сялянам, што можна гаспадарыць лепш і больш плённа.

Гайнаўшчына даволі багатая лугамі. На яе тэрыторыі знаходзіцца амаль 27 тысяч гектараў зялёных угоддзяў. Гэта асноўная база для жывёлагадоўлі. Калі палічыць, дык выходзіць, што цяпер кожныя сто гектараў зялёных угоддзяў кормяць на Гайнаўшчыне ледзь сорак каровак. Гэта мала, гэта шмат ніжэй ваяводскага ўзроўню, бо норма прадбачвае не менш 100 штук жывёлы на 100 га зямельных угоддзяў.

Гэтыя ўгоддзі не могуць быць абыякія. У Гайнаўскім павеце дагэтуль пасучаснаму загаспадарана ледзь 100 тысяч даўнейшага балота. Значыць, менш чым палавіна. Астаюцца яшчэ амаль не кранутыя цэлыя даліны рэк Нарвы і Нараўкі. Каб разводзіць жывёлагадоўлю, трэба іх меліяраваць. Здзейсніцца

(Працяг на стар. 4)

РАЎНЕННЕ НА НАЙЛЕПШЫХ

Сустрэча была назначана на 6 гадзіну вечара ў аўторак 20 лістапада. Калі ехалі мы ў Чорную Беластоцкую, безупынна падаў мокры снег і дуў востры, халодны вецер. Падумалася: хто ў такую пагоду захоча пакінуць хатнюю цеплыню, каб прыняць удзел у перадвыбарчай сустрэчы?

Аднак прасторная гімнастычная зала гмінnай васьмікласнай школы — новай, не так даўно пабудаванай — запоўнілася амаль да апошняга месца. Толькі першыя два рады крэслаў заставаліся не занятымі. Іх пакінулі для гасцей.

Відаць, жыхары Чорнай Беластоцкай добра разумелі, што ў час гэтай сустрэчы пойдзе гутарка аб найбольш істотных справах цяперашняга і заўтрашняга дня іх мястэчка, ваяводства і краіны. Афішы абвяшчалі ж, што прыедзе **старшыня Прэзідыума ВРН, доктар Зыгмунт Спрыха**, а разам з ім — старшыня прэзідыума ПРН у Беластоку **Базылі Гулька**, сакратар павятовага камітэта партыі **Генрык Скіба** і прадстаўнікі іншых ваяводскіх і павятовых установ па справах гандлю і асветы, што будзе мясцовая, чорнабеластоцкая ўлада, што абавязкова прымуць удзел у сустрэчы іх уласныя кандыдаты ў радныя ваяводскай, павятовай і гміннай радаў.

Першы выступіў старшыня Спрыха. Гаварыў аб значэнні I Краёвай партыйнай канферэнцыі, указанні якой сталіся выбарчай праграмай Фронту адзінства народу, аб паскораным тэмпе развіцця эканомікі краіны і ваяводства. Я занатаваў:



Выступае старшыня Прэзідыума ВРН у Беластоку, доктар З. Спрыха.

— На працягу трох апошніх гадоў мы перавыканалі ўсе раней планаваныя паказчыкі. Сур'ёзна павялічыўся нацыянальны даход. Амаль 6,5 мільёнам рабочых і служачых была павышана заработная плата. Дзякуючы гэтаму рэальны даход працоўных узрос так, як за 10 папярэдніх гадоў, значыць у гадах 1961—1971.

А пасля, калі старшыня пачаў характарызаваць эканамічна-грамадскае становішча Беласточчыны, я між іншым запісаў:

— У гадах 1971—1973 прамысловая і сельскагаспадарчая прадукцыя накаплялася ў нас шмат вышэйшымі тэмпамі, чым у іншых раёнах краіны. Арганізацыя і правядзенне Цэнтральных дажынак паказалі жыхарам усёй Польшчы, што мы патрапім добра і спраўна выконваць складаныя заданні. Пасля дажынак, — гаварыў старшыня, — неадночы даводзілася мне сустракацца з людзьмі з розных ваяводстваў. І дагэтуль не чуў я аніводнай адмоўнай апініі аб дажынках. Аднак толькі дасягнутым нам нельга задавальняцца. Цяпер нас абавязвае лозунг: РАЎНЕННЕ НА НАЙЛЕПШЫХ! І гэта датычыцца кожнага жыхара нашага ваяводства, незалежна ад яго пасады і месца ў грамадстве. Для гэтага маем поўныя асновы. Нашы фабрыкі і прамысловыя прадпрыемствы нарошчваюць сваю прадукцыю шмат хутчэй, чым дзеецца гэта ў краіне. Сярэдні паказчык прыросту прадукцыі для ўсёй краіны складае 12 працэнтаў, а ў нас — звыш 17. Адначасова трэба нам змагацца за павышэнне якасці прадукаваных тавараў, асабліва тых, якія непасрэдна трапляюць на наш і замежны рынак.

Старшыня гаварыў яшчэ аб многіх іншых вельмі тэрміновых і важных справах Беласточчыны, аб галоўных напрамках яе развіцця ў наступных гадах. Указваў ён, што перш за ўсё будзе ў нас разбудавана спажывецкая, тэкстыльная і мэблевая прамысловасці. Для такой прадукцыі маем мы ўласную сыравіну і хочам, каб магчыма як найбольш перапрацоўваць яе на месцы ў гатовыя вырабы. Была таксама гутарка аб падрыхтоўцы кадраў, аб жыллёвым будаўніцтве, разбудове гандлёвых і бытавых паслуг.

Прысутныя ў зале, пераважна рабочыя **Чорнабеластоцкай фабрыкі сельскагаспадарчых машын „АГРОМА"**, слухалі старшыню з увагай і поўным разуменнем. На іх жа вачах здзейсніліся такія перамены, аб якіх не снілі іх бацькі і дзяды. Невялікая вёска, закінутая ў Букштэльскія лясы, на працягу дваццаці з лішнім гадоў пераўтварылася ў васьмітысячны гарадок. Тут не трэба лепшага прыкладу паскоранага развіцця. Сыны і дочкі даўнейшых сялян і амаль усе гэтыя ж сяляне сталі цяпер рабочымі, майстрамі, інжынерамі, кіраўнікамі і загадчыкамі.

Такі аванс нарошчвае зусім новыя патрабаванні. Гэта адчувалася ў выступленнях прадстаўнікоў чорнабеластоцкай грамадскасці. Сабраныя разам, састаўляюць гэтыя патрабаванні галоўныя праблемы рабоча-сялянскага пасёлка. Вось некаторыя з іх, пераважна тых, якія ўжо гадамі чакаюць вырашэння: забеспячэнне жыхароў вадою, пабудова цэнтральнай катлоўні для абагравання жылых дамоў, жыллёвае будаўніцтва, пабудова дома культуры з пастаяннай кіно-тэатральнай залай, бо Чорная Беластоцкая з'яўляецца адзіным горадам у ваяводстве, які не мае ўласнага кіно, пабудова лекарскай амбулаторыі з аптэкай, абсталяванне сярэдняй прафесіянальнай школы...

Жыхары Чорнай Беластоцкай не толькі патрабуюць ад улад. Яны шмат чаго робяць самі. Вось прыклад: пабудова грамадскім чынам вялікага вадасховішча, ля якога будзе размешчана база для адпачынку.

Старшыня прэзідыума ПРН у Беластоку Б. Гулька некаторыя справы афармляў ад рукі, даваў паясненні, куды з імі накіравацца. Апраўдваліся памехамі прадстаўнікі ВЗГС і іншых гандлёвых установ, аб магчымасці пабудовы сярэдняй прафесіянальнай школы гаварыў работнік куратарыі.

Сустрэча закончылася позна вечарам, амаль пад поўнач.

В. Рудчык
фота аўтара

У Сейме ПНР

22 лістапада адбылося XIV пленарнае пасяджэнне Сейма ПНР. На парадку дня стаялі дзве важныя справы: 1) Дзяржаўны план і бюджэт на 1974 год, 2) Рэформа органаў улады і адміністрацыі.

Адносна першага пункта — адбылося першае чытанне праектаў пастаноў аб грамадска-гаспадарчым развіцці краіны ў 1974 г. і аб бюджэце на 1974 год. Праекты прадставіў старшыня Планавай камісіі пры Радзе Міністраў віцэ-прэм'ер М. Ягельскі.

Як ў выступленні дакладчыка, так і ў дыскусіі быў падкрэслены факт, што праекты даюць гарантыю далейшага паляпшэння ўмоў жыцця, разбудовы гаспадаркі і развіцця гаспадарчага супрацоўніцтва з заграніцай.

У праекце плана і бюджэту вялікі націск кладзецца на развіццё нашай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Будуць павялічаны матэрыяльныя сродкі на развіццё гэтых галін жыцця. Праект прадбачыў таксама шырокае развіццё паслуг. Бытавыя паслугі ў параўнанні з 1973 г. узрастуць на 22,8 працэнта, сельскагаспадарчыя — на 14,8 працэнта, рамонтна-будаўнічыя — на 34 працэнты, матарызацыйныя — на 40 працэнтаў. Паслугі павінны вельмі шырока развівацца і ў наступныя гады.

Адносна другога пункта выступіў прэм'ер П. Ярашэвіч, які прадставіў урадавыя праекты пастаноў: 1) Аб змене Канстытуцыі ПНР і 2) Аб змене пастановы аб радах народовых.

Змены датычаць павятовых і ваяводскіх органаў улады і адміністрацыі. Рады народовыя будуць аддзелены ад адміністрацыі. Будзе гэта спрыяць лепшаму і спраўнейшаму функцыянаванню мясцовых органаў улады і адміністрацыі.

Прэм'ер сказаў, што ўводзячы гэтыя змены, народная дзяржава і ўрад мелі на ўвазе прынцыпіяльныя асновы сацыялістычнага ладу, пастановы VI З'езду і I Краёвай канферэнцыі ПАРП, шматгадовы вопыт у дзейнасці радаў народовых, новыя патрэбы і заданні дынамічнага развіцця Польшчы, першыя пазітыўныя вопыты ў працы гмінных радаў і начальнікаў гмін.

На чале прэзідыума рады будуць стаяць першыя сакратары павятовых ці ваяводскіх камітэтаў ПАРП. Кіраваць адміністрацыяй будуць ваяводы, начальнікі павятаў і гарадоў, а ў гарадах звыш 100.000 жыхароў і ў гарадах-сядзібах ваяводстваў — прэзідэнты.

Сейм зацвердзіў таксама запрапанаваныя прэм'ерам П. Ярашэвічам змены ў складзе Рады Міністраў. Сейм прыняў пастанову аб адкліканні з пасады міністра флоту — Ежы Шопы і міністра лясніцтва і драўнінnай прамысловасці — Ежы Попкі. Міністрам флоту назначаны Казімеж Альшэўскі пры захаванні яго ранейшай функцыі — віцэ-прэм'ера Рады Міністраў, а міністрам лясніцтва і драўнінnай прамысловасці — Тадэуш Сквіжынскі, дагэтуль старшыня Прэзідыума ВРН у Быдгашчы.

Ежы Шопа адышоў на пенсію, а Ежы Попка назначаны віцэ-старшынёю Найвышэйшай Ізбы Кантролю (НІК). (вл)



Niedziela — 2.XII.73
7.25 Program dnia. 7.30 TV Kurs Rolniczy. 8.05 „Przypominamy, radzimy". 8.15 Nowoczesność w domu i zagrodzie". 8.35 „Bieg po zdrowie". 8.45 PKF. 9.00 TELERANEK. 10.20 „Antena". 10.35 „Człowiek przyrodzie" — film dok. ang. („Świat, który nie może zaginąć"). 11.00 „Piórkiem i węglem". 11.25 TV Koncert Życzeń. 12.00 Dziennik. 12.15 „W starym kinie" — Luis Bunuel. 13.05 „Na chłopski rozum". 13.35 „Piosenka dla Ciebie" 14.25 Dla dzieci: S. Michałkow „Trzy pomarańcze". 15.25 Bank Inicjatyw Miast: Milanówek — Ryki. 16.25 Losowanie Totolotka. 16.40 „Coś podobnego" (III). 17.50 „Kryteria" 18.00 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.20 „Perła w koronie" — film fab. pol. („Robotnicze drogi"). 22.55 Sprawozdanie z Pucharu Przyjaźni w jeździe figurowej na lodzie.

Poniedziałek — 3.XII.73
12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 15.00 Centralna Akademia z okazji Dnia Górnika. 17.45 Dziennik. 17.55 TV Kurier Białostocki. 18.10 Oferty. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Eureka. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr TV: „Norwid". 21.50 Forum. 22.35 Dziennik. 22.50 Utwory fortepianowe W. A. Mozarta gra Jaśmina Strzelecka.

Wtorek — 4.XII.73
9.00 „Rozbity puchar" — film franc. („Pani de Monsoreau") odc. IV. 10.00 Dla szkół: (kl. II lic.) Język polski. Juliusz Słowacki „Kordian" — I. 15.20 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 15.55 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Rodzina Durtolów" — film franc. — odc. XII. 17.00 „Górnictwo najbliższego jutra" — rep. 17.35 Dla młodzieży: Konsultacje. 18.05 „Inter — tie 72" — rep. film. z Międzynarodowego Festiwalu w Middlesborough. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Warszawskie perspektywy. 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Rozbity puchar" — film franc. („Pani de Monsoreau") odc. IV. 21.10 Świat i Polska. 21.55 „Pan Fafuła na Wystawie Paryskiej" — wodewil wg. F. Schobera. 22.45 Dziennik. 23.00 Wiadomości sportowe.

Środa — 5.XII.73
9.00 Dla szkół: (kl. VI) Fizyka. „Nacisk i ciśnienie". 9.30 „Niepokoje wychowanka Törlessa" — film fab. NRF: 11.05 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie plastyczne. „Grafika". 12.00 Dla szkół: (kl. VIII) Historia. „Ostatnie lata drugiej Rzeczypospolitej". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Fizyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Mechanizacja rolnictwa. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Latający Holender". 17.10 Dla dzieci: „Dźwięki i czary". 17.35 Losowanie Małego Totka. 17.45 Telereklama. 18.00 Sylwetki X Muzy — Barbara Wrzesińska. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Magazyn Medyczny. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Kino Interesujących Filmów: „Niepokoje wychowanka Törlessa" — film fabul. NRF. 21.45 „Prosto z Polski". 22.15 Śpiewają bracia Olsen. 22.45 Dziennik. 23.00 Wiadomości sportowe.

Czwartek 6.XII.73
9.05 „Zły duch Adelajdy Winters" — film fab. USA („Alfred Hitchcock przedstawia"). 10.00 Dla szkół: (kl. II lic.) Język polski. Juliusz Słowacki „Kordian" II. 11.05 Dla szkół: (kl. VII—VIII) Język polski. „Radio". 13.30 TV Kurs Informatyki: Metody informatyki „Automatyzacja obliczeń zawodowych inżynierskich". 14.00 Matematyka w szkole: „Prostokąty i kwadraty". 15.20 TV Technikum Rolnicze: Fizyka. 15.55 TV Technikum Rolnicze: Mechanizacja rolnictwa. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem". 17.45 PKF. 17.55 Gramy o telewizor. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Mazowsze dziś i jutro. 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc 19.30 Dziennik. 20.15 „Zły Duch Adelajdy Winters" — film fab. USA („Alfred Hitchcock przedstawia"). 21.05 Prosto z Polski. 21.35 Ekspres Nr 40. 22.05 Informacje — Towary — Propozycje. 22.20 Dziennik. 22.35 Wiadomości sportowe.

Piątek 7.XII.73
9.30 „Gonitwa" — film fab. polski. 11.05 Dla szkół: (kl. VII) Wychowanie obywatelskie „Łączy nas praca". 12.00 Dla szkół: (kl. III) „Barburkowe święto". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Język polski. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 15.20 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Praca kontrolna nr 3. 15.55 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Zadania z geometrii. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 Nie tylko dla pań. 17.50 Dla młodzieży: Tygodnik Informacyjny Młodych, Dwie szkoły — telekonkurs. 18.25 Kronika Warszawy i Mazowsza. 18.45 Orbita. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Piosenki Marka Lustiga. 20.50 Panorama. 21.30 Teatr TV: A. Ostrowski „Panna bez posagu". 22.50 Dziennik. 23.05 Wiadomości sportowe.

Sobota 8.XII.73
8.30 „Najlepsza kobieta mojego życia" — film fab. czechosł. 10.00 Dla szkół: (kl. VII). Geografia. „Rumunia". 11.05 Dla szkół: (kl. VIII) Nauka o człowieku. „Układ oddechowy". 14.20 TV Technikum Rolnicze: Język polski. 14.55 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 Puchar Interwizji w gimnastyce artystycznej. 18.10 „Władcy soli" („Wykopaliska, odkrycia, sensacje"). 18.35 Godzina Orfeusza. 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 Mała Scena Teatru Rozrywki: „Wysiadywaczka". 20.50 „Najlepsza kobieta mojego życia" — film fab. czechosł. 22.15 Dziennik. 22.30 Wiadomości sportowe. 22.40 „Canzonissima" — włoski program rozrywkowy.



Piątek, 30 listopada
7.30 Szkoła szachów. 8.00 Film fab. 10.00 Balet. 13.15 Program dnia. 13.30 Film dokument. 17.00 Film fab. 19.00 Czas. 20.00 Program estradowy. 21.00 Program sportowy.

Sobota, 1 grudnia
7.00 Program dnia. 8.00 Przegląd międzynarodowy. 8.15 Mozaika muzyczna. 8.25 Białe i czarne. 9.15 Koncert. 10.40 Film fab. 12.30 Balet na lodzie. 13.15 Filmy animowane. 14.00 Film fab. 14.30 Piosenka — 73. 15.00 w świecie zwierząt. 17.15 Seryjny film fab. I seria. 19.00 Czas. 19.45 Teatr miniatur. 20.50 Koncert.

Niedziela, 2 grudnia
7.00 Program dnia. 9.00 Spektakl TV. 10.00 Kiosk muzyczny. 10.30 Ekran i czas. 11.30 Komedia filmowa. 13.00 TV konkurs pieśni. 14.00 Panorama międzynarodowa. 14.30 Filmy animowane. 14.00 Film dokument. 16.10 Program muzyczny. 16.45 Klub filmowy. 17.45 Film fab. 19.00 Czas. 19.30 Panorama filmowa.


БЕЛАВЕЖА

ОРГАН ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ ПРЫ ГП БГКТ № 179



Давай яшчэ раз затанцуем
пад скрыпкі салаўёў-паэтаў
пад зялёны раяль дубровы
давай яшчэ раз затанцуем
закружымся у травы рынем
і дамо пачатак сыну
што ў пульсах нашых б'ецца
як кроплі вады ў нетрах
як атамы ў бурным ветры
у травы рынем
і сплодзім сына.

Алесь Барскі



ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМ

працэс стварэння
майго існавання
быў выпадкам
або карысталюбным
эксперыментам

лічылі дні
майго нараджэння
нехта купляў кветкі
хтосьці купляў калясачку
світарок

не пыталі мяне
ці я хачу ці не
не мела я ўплыву на гэта
ці буду існаваць ці не

я проста ўкінутая
ў існаванне

са зводняй кандыцыі
асуджаная на свабоду
буду тым
чым сама сябе ўчыню

ці знайду ў сабе апору
ці рассеюсь у занятках штодзённасці
ці ўнікну сваёй долі
ці змагу тварыць сэнсы

непакой не змаўкае
час адсланяе
цэлую маю штучнасць
і непатрэбнасць
(значыць іграю штуку жыцця)

не я не адзінокая
не я не пакінутая
шукаю свайго бога
малюсь афарызмамі:
няхай сродкі
не станууца мэтай

ёсць жа выхад
годны чалавека
пераступаць за сябе
паднімацца па-над сябе
безупынна
безупынна

чалавек мусіць
стала верыць у тое
што мае ў сабе
незнішчальнае.

З. Сачко



СЭРЦА МАЦІ

Кажуць, што два сэрцы кахаюцца... Сэрца дзяўчыны стукае пры відзе каханага хлопца і наадварот. Сябры, але звярніце ўвагу, што цэннасць сэрца прыяцеля заглушае дабрачыннасць сэрца маткі.

Ціхенька
звіняць
твае словы, мама,
шчыкатліва
дрыжаць,
прыемна
прымае іх дзіця.
Мама, сэрца тваё адкрытае,
Сэрца тваё ад вякоў знанае.
З сэрца твайго словы, хвалі, плывуць,
У гэрцы-гарнцу, як кіпячы мёд,
уздымаюцца.

Вочы —
дзве зоркі ясныя
да канца
жыцця
прысвячаць
нам будуць,
шлях
жыццёвы
вызначаць.
Мама, сэрца тваё кахаем
Над цану золата ставім,
і сапраўды рэчаіснасць
дабраты ў вачах тваіх адбіваецца.
Перабачаеш
нам
крыўды,
памылкі
жыццёвыя,
паступкі неразважныя,
мама...
Пра маму, маму і яе сэрца
спяваць і славіць голас рвецца,
ўзляцець высока, аж пад неба
і ўспалыхнуць святлом агнявым.

Ніна Гаўрылюк





Чаму закрытыя вокны
чаму зноў снег за вакном
і ноччу і ўдзень
і вочы чаму пустыя
ўсё роўна
камень у цела
не запусціць карэнняў
ні вейкі ў шкло

чую як хмары ідуць
труць аб коміны поўнымі жыватамі
як хтось знагла паветра змуціў
і вецер памчаў магільны
ў апусцелых панадворках
чаму...

яшчэ лясных краявідаў шукаць
дзе каханне з дзіцячым тварам
задрамала на грудзях лугу
— душа мая
станься дзіцём.

Кастусь Бандарук

Аня

(КАРОТКАЯ БІЯГРАФІЯ)

Аня нарадзілася ў тысяча дзевяцьсот саракавым годзе. Хадзіць вучылася ў маці і бацькі. Першую ляльку пашыла сама. Ад пятага году чысціла зубы, мылася па пояс. Дзяўчынкі шанавалі яе, хлопчыкі прыглядаліся. Аня ведала літары!

Першы клас закончыла з пяцёркамі. Гэтаксама другі клас. У пятым — адкрыла памылку ў падручніку.

Хлопцы не біліся снежкамі, калі яна выходзіла са школы. Дакладна — у сёмым класе заваявала першае месца ў матэматычнай алімпіядзе. У ліцэй Аню прынялі без уступных экзаменаў. Гэта за выдатныя адзнакі.

У ліцэі правучылася выдатна. Не малявала губоў. Залёты канчала на першым або другім позірку. Удзельнічала ў гуртку маладых матэматыкаў. На вучнёўскія вечарыны хадзіла у дзесятым і адзінаццатым класах; танцавала з сяброўкаю. Жартаў не слухала, засвойвала танец.

У адзінаццатым класе Аня ўдарыла па шчацэ Андрэя. Ён спрабаваў праводзіць яе з вечарыны.

У час выпускнога балю танцавала: з бацькам, з маці, з класным выхавацелем і старшынёй бацькоўскага камітэта. Старшыня пацалаваў яе ў руку, п'яны. Андрэю адмовіла белае танга, дагарэў у куце.

Універсітэт. Залікі здавала не пацеючы, упэўнена. Да экзаменаў падыходзіла мужчынскім крокам, хлопцы адварочваліся. Уласціва — пад канец трэцяга курса бачыла будучыню. Заставалася недалёка, два курсы пакрай плытка закаранелых дубкоў без перспектывы ценю, хуткага. Выраслы дуб за небакраем. Пад ім будучыня: асобны дом — з гаражом, грошы — па патрэбнасці, час — удосталь, немагчымасці — пад абцасам.

Выйшла замуж за калегу бацькі, досыць маладога. Пазнаёмілася з ім у час сямейнай урачыстасці з выпадку атрымання ёю дыплома, былі запрошаны многія.

Вяселле адбылося праз тры месяцы, 13 кастрычніка — у трэцюю нядзелю перад Святам Памёршых.

Сакрат Яновіч

ТРЫЗНЕННЕ

Не ўшчаслівіш
шчаслівых да канца,
абсалютна.

———

Эх ты, жаль,
і ты, горыч палючая,
што стаіш на дарозе
— пусцi
— пуста?
Нібы пуста — сцвярджэнне.

———

А неба так высока,
плюнь на неба — мары.

———

Зноў дарога —
не плач, маленькая,
ты разбіла каленка
— ой баліць?
Не плач, перастань
— ужо не баліць?
Смяецца...
ямачкі на шчоках —
дзяўчынка, гады чатыры
— тклівасць

———

Адзін чорт знае
навошта, абагульненне.

Ірэна Баравік



На бельскай гаворцы

Пройшлі тыйі ліета


Чую як у саді
Соловіей співае,
Ёго піесня в далі
Бы ручай сплывае.
Бачу бледный міесэць
Над окном склонівся.
В лісцях чэрэмшыны
Віетёр закрутівся.
Крачут дэсь вороны
Взорваны трывогой,
Як жэ дзісь далеко
Я од дому свого.
Помню, як бувало
У сэлі родно́му,
Йшлі мы на музыкі,
Нэсучы гармоню.
Пройшлі тыі ліета
Осталісь вспоміны,
По садах зэлёных —
— піесьнях соловйінных.

Ваня Кірызюк.

ПАВАРОТ

Усміхаўся мне лёс
Ненадоўга
Шмат абцёр я ўжо рос
Усё роўна
Адышоў я туды скуль прышоў
Да карчавістых лоз
Да лугоў
Не
Па тым што пакінуў
Не плачу
Мае вочы прывыклі бачыць
Ранні золак
Красу
Жыццё тое простае
Што дало мне душу

Ул. Гайдук



Пачатак на стар. 1

1 мільён і 45 тысяч



гэта, безумоўна, яшчэ да канца гэтага дзесяцігоддзя.

Аднак чакаць бяздзейсна аж да часу меліярацыі гэтых вялікіх водных комплексаў нельга. Калі Гайнаўшчына ўсур'ёз хоча кожны год стан сваёй жывёлагадоўлі павялічваць не менш чым на 10 працэнтаў, дык дзейнічаць трэба ўжо цяпер, ды дзейнічаць паслядоўна і рашуча.

Сакратар Дваракоўскі ўказвае два асноўныя напрамкі: аднаўленне пароды быдла і жывёлагадоўчую спецыялізацыю сялян. Ваяводскія ўлады гарантуюць для Гайнаўшчыны пастаўку 1 800 штук маладых кароў і цялят нізіннай чорна-белай пароды, якая намнога больш прадуктыўная чым пануючая цяпер чырвоная польская. Прыдалося б, вядома, больш, але няма адкуль іх браць. Дык трэба інтэнсіўна разводзіць тое, што ўжо сяляне атрымоўваюць. Таму пародзістыя гадаўляны матэрыял павінен трапляць перш за ўсё ў рукі вопытных гадоўцаў. І тут узнікае праблема спецыялізацыі. Тысячы дзве гаспадароў у Гайнаўскім павеце мае займацца гадоўляй малочных кароў і крыху больш будзе гадаваць маладняк на мяса. Тут перш за ўсё найбольш прыдатнай пародай з'яўляюцца шаралезы.

Адным з раёнаў Гайнаўскага павету, дзе прадбачваецца інтэнсіўнае развіццё жывёлагадоўлі, з'яўляецца гміна Чыжы. Кіраўнік тамашняй сельскагаспадарчай службы, аграном Мацей Дзівенга інфармуе, што абмен чырвонай польскай пароды на нізінную чорна-белую і шаралез распачалася ў Чыжоўскай гміне яшчэ ў ліпені гэтага года. Сяляне атрымалі звыш 300 штук цялят і ялавак.

— Стараемся, — гаварыў аграном, — каб пародзістыя матэрыял трапіў да добрых гаспадароў. Для прыкладу, Сцяпан Якімюк з Чыжоў на сваёй дзесяцігектаравай гаспадарцы трымае ўжо 6 кароў і 15 свіней. А цяпер прадалі мы яму цялічку „нцб". Другі Якімюк з Чыжоў, Васіль, старшыня мясцовага сельскагаспадарчага гуртка, мае 11 га зямлі і трымаў 7 штук кароў. Цяпер купіў яшчэ двое цялят „нцб".

Чыжоўская гміна — адна з лепшых на Гайнаўшчыне ў галіне развіцця жывёлагадоўлі. Тут на 100 га зямельных угоддзяў прыпадае ўжо 54 штукі быдла. Гэта нават вышэй сярэдняй ваяводскай. Затым інтэнсіўнае развіццё жывёлагадоўлі наглядаецца ў Кляшчэлеўскай і часткова ў Дубіцкай гмінах, а пасля меліярацыі даліны Нарвы будуць і там спрыяльныя ўмовы для пародзістых красуль.

Дарога да 45 тысяч кароў на Гайнаўшчыне вядзе таксама праз інтэнсіўнае абучэнне сялян на вячэрніх курсах. Адначасова трэба заахвочваць іх, каб спалучалі свае сілы і калектыўна займаліся жывёлагадоўляй.

М. Нурэцкі

ВЕЛАСІПЕДАМ У ШКОЛУ

Вельмі добра сталася, што паасобныя ўстановы прыхіліліся да акцыі „Веласіпедам у школу" і на працягу кароткага часу купілі і перадалі найбольш патрабуючым і добрым вучням больш 80 веласіпедаў. Найбольш веласіпедаў купілі вучням Ваяводскае праўленне Таварыства сяброў дзяцей (19 штук) і Беластоцкае прадпрыемства другаразовай сыравіны (12 веласіпедаў). Па тры веласіпеды атрымалі, між іншым, гмінныя школы ў Супраслі (Беластоцкі павет) і ў Кляшчэлях (Гайнаўскі павет). Варта дадаць, што гэтыя школы штогод збіраюць шмат макулатуры.

Наш рэпарцёр прысутнічаў пры ўручэнні веласіпедаў вучням з супрасльскай школы. На здымку дырэктар БПСВ мгр Мікалай Зіневіч уручае веласіпед адной з вучаніц, якая ходзіць у школу з далёкай вёсачкі.



Тэкст і фота **Я. Ц.**

СУСТРЭЧЫ З КАНДЫДАТАМІ Ў РАДЫ НАРАДОВЫЯ

Аляксандр БАЖКО

Маладое пакаленне сялян, якое яно?

Адказ я спрабаваў шукаць у размове з Аляксандрам Бажко з вёскі Сухавольцы, Гайнаўскага павету. Нарадзіўся ён у 1950 годзе. Пасля пачатковай школы паступіў на сталярнае аддзяленне прафесіянальнай школы ў Гайнаўцы, затым працаваў столярам на Бельска-Падляшскім будаўнічым прадпрыемстве. Але нядоўга. А. Бажко вось ужо чацвёрты год вядзе разам з бацькамі 13-гектаравую гаспадарку. Яны нядаўна паставілі прыгожы, абшырны мураваны дом, салідныя мураваныя хлявы, абзавяліся сельскагаспадарчымі машынамі. У іх тры дойныя каровы, 2 цялушкі, шмат свіней, многа хатняй птушкі. Дом абсталяваны сучаснай мэбляй.

— Ці не падабалася вам праца столяра на прадпрыемстве?

— Мне добра працавалася, і заробкі як для пачынаючага працаўніка былі нядрэнныя. А сталярнічаць я люблю. Вось у доме паклаў падлогу і пры хлявах шмат чаго сам зрабіў. Але працуючы ў Бельску, я заўважыў, што самім бацькам цяжка весці гаспадарку: і здароўе слабое і сілы не стае. Што і казаць — гаспадарка не развівалася. І я з ахвотаю сам засучыў рукавы, цяпер не наракаю. Вось учора мы закончылі малацьбу. Жыта „Влашчаноўскае" дало не менш як па 30 цэнтнераў з гектара, авёс „Пшэбуй 2" — па 27 цэнтнераў. Бульба родзіць таксама добра, у гэтым годзе „Флісак" даў па звыш 300 цэнтнераў з гектара. Зямля ў нас слабаватая, у асноўным V—VI класы. Але калі яе дагледзець і даць адпаведнае ўгнаенне, родзіць не горш, чым добрыя глебы. У мінулым годзе я высеяў штучных угнаенняў па 140 кг у чыстым спажыўным рэчыве на гектар, а ў гэтым ужо па 200 кілаграмаў. Маю ўсяго паўгектара лугу. Але і на гэта знайшоўся спосаб — усяваю ў жыта і авёс сырадэлю і маю збожжа і дасканалую пашу, два ўраджаі ў адзін год.

— Ці вы навучыліся гаспадарыць так сам па сабе?

— Ведаеце, я пераканаўся, што да гаспадаркі патрэбны ў большай меры веды і практыка, чым сіла. Многа чытаю сельскагаспадарчай літаратуры, а практыку праходжу ў нашым сухавольцаўскім гуртку сельскагаспадарчай падрыхтоўкі. Яго вядзе А. Младзяноўская — кіраўнік сельскагаспадарчай службы Кляшчэлеўскай гміны. Вядзем доследныя палеткі, параўноўваем вынікі. Цяпер заняліся ўводам у гадоўлю нізіннай чорна-белай расы кароў. Усе 14 членаў нашага гуртка набылі цялушкі гэтай расы. Гадуюцца добра. Праўда, працы ёсць шмат — мне даверылі ў гуртку адказнасць за вучобу, арганізацыю конкурсаў і іншых навучальных і доследных спраў.

— А ў працы маладзёжных і грамадскіх арганізацый удзельнічаеце?

— Так, і перш за ўсё ў Саюзе сацыялістычнай сялянскай моладзі. Вось ужо трэці год з'яўляюся старшынёй нашага сухавольцаўскага гуртка ЗСМВ, членам гміннага праўлення ЗСМВ у Кляшчэлях, у ім мяне выбралі намеснікам старшыні па грамадска-прафесіянальных справах. Уваходжу таксама ў склад пленума павятовага праўлення ЗСМВ у Гайнаўцы. Удзельнічаю і ў працы нашага гуртка Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Абодва гурткі ЗСМВ і БГКТ дзейнічаюць разам, маем драматычны гурток, у ім 11 асоб. Паставілі ўжо некалькі п'ес, між іншым, „У ціхім кутку", „Дзесяць гектараў", „Конскую кніжку". Апошнім часам — „Кактусік" на польскай мове. Цяпер падбіраем нешта на гэты сезон. Прымалі мы таксама ўдзел у „Вясне чынаў", працавалі пры рамонце дарог. Летам пасаблялі старым і адзінокім сялянам пры жніве. А вось нядаўна здабылі ў гміне матэрыялы і перакрылі адзінокай старушцы дах на хаце. Цяпер жа зоймемся вучобай.



— Вы з'яўляецеся кандыдатам у радныя Ваяводскай рады нарадовай. Якія справы з сельскага жыцця вы лічыце найбольш актуальнымі і вымагаючымі вырашэння?

— Перш за ўсё — гэта дбайнае выкарыстанне кожнага кавалачка зямлі ды няспыннае павышэнне ўраджаю і павелічэнне гадоўлі. А ў гэтай справе важную ролю адыгрывае забеспячэнне сяла вадою з водаправодаў. Наша вёска ўжо рыхтуецца да гэтай інвестыцыі. У конкурсе „Беластоцкая вёска гаспадарная і культурная" мы занялі ў 1972 годзе вядучыя месцы ў павеце і ваяводстве і здабылі ў суме 200 тысяч злотых узнагароды. Гэта добры пачатак для будовы водаправода. Надта патрэбны таксама ў міжгуртковых машынных базах больш прадукцыйныя машыны, асабліва камбайны. Вымагае вырашэння і праблема селішчаў у вёсках-вуліцоўках. Селішчы ў іх надта вузкія, невыгодныя, няма дзе будаваць сучасныя хлявы і клуні, ды і з машынамі не павернешся. Больш увагі вымагае праца з маладымі сялянамі, яны адважней і ахвотней уводзяць у сябе сучасныя інтэнсіўныя метады гаспадарання. Таму сельскагаспадарчая служба не павінна скупіцца на працу з маладымі гаспадарамі і гаспадынямі. Здаецца, што ўжо настаў час, каб стварыць у гмінах мясцовы калектыў лектараў для вядзення ў вёсках лекцый па актуальных праблемах палітыкі і гаспадаркі. Сядзіба гміны ўжо мае магчымасці ператварыцца ў мясцовы цэнтр культурнага жыцця. А дзеля гэтага гмінныя дамы культуры патрабуюць спецыялістаў, якія б маглі прыйсці з дапамогай вясковым самадзейным мастацкім калектывам. У нас гэта вельмі добра робіць Славамір Місеюк, але ён — гэта рэдкасць ва ўсім наваколлі. У гміне патрэбны таксама спартыўны цэнтр з добрым стадыёнам, інструктарамі, пазычальняй спартыўных прылад, міжвясковымі і міжгміннымі розыгрышамі.

Дык вось якое наша маладое пакаленне сялян!

Мікалай Гайдук
Фота аўтара

Беларуская літаратура — Аляксандр Баршчэўскі

Нашаніўская пара

КАРУСЬ КАГАНЕЦ (1868—1918) — ЧАСТКА І.

Карусь Каганец (сапраўднае прозвішча Казімір Кастравіцкі), як і Ядвігін Ш., быў пісьменнікам, звязваючым беларускую літаратуру XIX стагоддзя з літаратурай XX стагоддзя. Быў ён тыповым нашаніўцам і па сваёй дзейнасці, і па сваёй ідэалогіі, і па сваёй творчасці.

Паходзіў Каганец з абяднеўшай беларускай шляхты. Незайздросная эканамічная пазіцыя гэтай шляхты радніла некаторых яе прадстаўнікоў з імкненнямі і ідэалогіяй сялян. Нямала аднак сярод гэтай сацыяльнай групы было і такіх, што з пагардай адносіліся да сялянскай звычаёвасці і мовы. Каганец дасканала бачыў недарэчную абмежаванасць такіх прадстаўнікоў шляхты і жорстка высмяяў іх у сваёй п'есе „Модны шляхцюк".

Нягледзячы на тое, што Каганец прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыянальным руху і ў дзейнасці „Нашай нівы", не многа ведаем аб яго жыцці. Бадай, гэта было прычынай памылак у спробе акрэслення месца яго нараджэння, якія паявіліся, між іншым, у вядомай хрэстаматыі Дварчаніна. Дварчанін піша, што Каганец „Радзіўся недзе ў Гародзеншчыне, каля Белавежскай пушчы". Інфармацыя гэта не згодна з праўдай. Каганец нарадзіўся 10.02.1868 г. у далёкім сібірскім горадзе Табольску. Туды быў высланы ў ссылку бацька пісьменніка — удзельнік студзеньскага паўстання 1863 года. У 1874 годзе Каганец вярнуўся ў Беларусь. Займаўся рознымі прафесіямі. Працаваў на гаспадарцы, быў леснікам, выконваў функцыю дзесятніка на будове чыгункі.

Каганец падкрэсліваў сваё высокае баярскае паходжанне, пры тым аднак гаварыў аб сваіх кроўных сувязях з сялянствам. Паслухайма пісьменніка:

„Я — кроў з крыві і косць з косці беларуса, з даўнейшых баяр княжаства Мсціслаўскага, каторы меў айчыма мужыка падняманскага. І сам я часу колькі змалку, а потым, будучы ўжо дзецюком, жыў між сялянамі і разам пасвіў, разам працаваў і цяпер маю між імі сваякоў, дзеля гэтага я маю права павядаць ад імя сваіх сроднікаў-беларусаў."

З цікавейшых фактаў у жыцці Каганца варта прыгадаць яго навуку ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу ў гадах 1885—1888. Факт гэты ў значнай меры акрэсліў удзел Каганца ў беларускім мастацкім руху нашаніўскай пары.

Нельга таксама не сказаць аб Каганцу як аб палітычным дзеячу. Прымаў ён актыўны ўдзел у стварэнні і дзейнасці Беларускай рэвалюцыйнай грамады і Беларускай сацыялістычнай грамады, якая была заснавальнікам і ініцыятарам усяго нашаніўскага руху. Як член цэнтральных улад гэтых арганізацый Каганец вёў агітацыйную работу сярод сялян. Гэтая агітацыя завяла яго два разы ў царскую турму. Першы раз сядзеў Каганец на пераломе 1905 і 1906 гадоў, другі раз ад 26.VII.1910 да 26.VII.1911 года. Сядзеў Каганец у Мінскай турме, у той самай, у якой з 1908 па 1911 год прабываў таксама другі пісьменнік-нашанівец Якуб Колас.

Каганец ужо ад прыроды не быў чалавекам моцнага здароўя. Меў ён пашкоджаны хрыбет, што было прычынай прыгорбленасці яго фігуры. Прабыванне ў турме радыкальна пагоршыла здароўе пісьменніка і зрабіла ўплыў на яго заўчасную смерць. Памёр пісьменнік на пяцідзесятым годзе свайго жыцця 20 мая 1918 года. Пахаваны Каганец на Навасёлкаўскіх могілках, якія знаходзяцца ў шасці кіламетрах ад Дзяржынска (Койданава).

Ужо спамянуты беларускі даследчык Касцяровіч пісаў: „Недалёка ад магілы, за кіламетраў шэсць, у Прымагіллі ля Юцкаў яшчэ стаіць хата, у якой пражыў большую палову веку Каганец. Уваход у яе праз такі ж невялічкі хлеў. Падлогі няма. Два ваконцы. Глінабітая печ. Гэта прычынілася дрэннаму здароўю Каганца. Да яе пазней прыбудавана другая хата з крытым ганкам, а паўз лесу стаіць магутная хвоя, пад якой Каганец тварыў свае вершы" (М. Касцяровіч, На Каганцовай магіле. „Савецкая Беларусь" 1928 г., нр. 17).

З цытаты відаць, што жыллёвыя ўмовы ў Каганца былі вельмі скромныя. Але мела гэта і добры бок: чалавеку, які жыве ў бядзе, лёгка зразумець бяду іншых.

БГКТ-оўцы кандыдаты ў радныя

Сярод кандыдатаў у радныя павятовай рады нарадовай у Саколцы ёсць таксама дзеячы і члены сакольскага аддзела БГКТ.

Аляксандр Рафаловіч — многагадовы член Прэзідыума Галоўнага праўлення БГКТ і аднчасова намеснік старшыні сакольскага праўлення аддзела. Ён быў адным з тых, хто найбольш дзейнічаў пры стварэнні і развіцці БГКТ на Сакольшчыне. Аляксандр Рафаловіч многа год працуе на пасадзе сакратара павятовага камітэта ЗСЛ і шмат гадоў з'яўляецца таксама радным павятовай рады нарадовай. За добрую працу ўзнагароджаны Афіцэрскім Крыжам Адраджэння Польшчы, Залатым Крыжам заслугі і іншымі ўзнагародамі.

Кастусь Мацько — член прэзідыума сакольскага аддзела БГКТ. Многа год працуе ён у сакольскім ПЗГС-е, а цяпер яго ўзначальвае. За добрую працу адзначаны шматлікімі ўзнагародамі.

Яўгень Жамойда — жыхар вёскі Паўднёвы Востраў і яе перадавы гаспадар, атрымлівае высокія ўраджаі і развівае жывёлагадоўлю. Шмат год з'яўляецца ён актыўным членам БГКТ і членам ПАРП. Адзначаны Сярэбраным Крыжам заслугі.

Мікалай Гаспэрчык — актыўны член БГКТ, настаўнік з Шудзялава, а жыхар Паўночнага Вострава. У сваёй роднай вёсцы з'яўляецца сакратаром партыйнай арганізацыі, а ў Шудзялаўскай гміне выконвае функцыю гміннага старшыні ЗСМВ. Функцыю павятовага раднага выконвае і цяпер. Адзначаны Сярэбраным Крыжам заслугі.

Віталіс Філіпік — актыўны член БГКТ, дырэктар васьмікласнай зборнай школы ў Крушынянах. Дзякуючы яго арганізатарскай працы, школа залічаецца да аднай з лепшых у павеце. Быў раней радным у Гурцы і членам ПК у Саколцы. Адзначаны Сярэбраным Крыжам заслугі. (мх)

НАШЫ СЯБРЫ

Аляксандр Сахарчук

Пісьманосец Аляксандр Сахарчук з Клейнік Гайнаўскага павету карыстаецца вялікай сімпатыяй у вясковым асяроддзі. Ведае, як весці сябе сярод людзей, як з імі пачаць размову, хаця, вядомая рэч, не ўсе пісьмы, якія даручае, прыносяць добрыя весткі.

— Але людзі чакаюць заўсёды добрых вестак, — кажа Аляксандр Сахарчук. — Я вельмі зжыўся з людзьмі ў раёне свайго абслугоўвання. Здаецца, нядаўна насіў я ў суседнюю вёску калярову тэлеграму з найлепшымі пажаданнямі для бацькоў, у якіх нарадзіўся сын. А сёння яму ўжо 10 гадоў і яму ўжо даручаю пісьмы.

Хутка зыходзіць час у пісьманосца. Падумаць толькі, пісьманосец Аляксандр Сахарчук штодзень праходзіць не менш 25 кіламетраў, а дзе лепшая дарога, едзе матавеласіпедам. Прывозіць пасылкі ў такія вёскі, як Малыя і Вялікія Тынявічы, Існок, Сапава, Рачкі, Слівова, Тынкаўшчызна. У апошні час мае ён 114 экземпляраў нашага тыднёвіка „Ніва".

Аляксандр Сахарчук многа ўвагі прысвячае таксама падпісцы на сельскагаспадарчую прэсу, перш за ўсё на часопісы "Хлопская Дарога", „Малады селянін", „Плён", „Аграхімія", „Жывёлагадоўля", „Гаспадыня" і іншыя.

Справа падпіскі на часопісы з'яўляецца вельмі важнай у працы кожнай паштовай установы. Многа ўвагі падпісцы, а ў тым ліку і справе распаўсюджвання „Нівы", прысвячае таксама шматгадовы начальнік пошты ў Клейніках Сцяпан Кот. Ён дау прыклад для пісьманосца Аляксандра Сахарчука, як здабываць новых падпісчыкаў на „Ніву" і іншыя часопісы.

Нас цешыць факт, што ў клейніцкай акрузе іменна „Ніва" з'яўляецца найбольш папулярнай. Сардэчна віншуем клейніцкага пісьманосца з узнагародай ад рэдакцыі "Нівы" і дыпломнай узнагародай ад дырэктара павятовай паштовай установы ў Гайнаўцы.

Варта адзначыць, што Аляксандр Сахарчук узнагароджаны адзнакай „Перадавіка працы" і што гэта адзін з лепшых пісьманосцаў у Гайнаўскім павеце.



Тэкст і фота **Я. Ц.**

„БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-73"



Удзельніца фінальнага агляду Бажэна Грыка з Саколкі.

Фота А. Карпюка.

КОНКУРС

Што ведаеш аб туберкулёзе і алкагалізме?

1. Назавіце два часопісы, прысвечаныя барацьбе з алкагалізмам.
2. Што прынёс хворым супрацьтуберкулёзны закон з 1959 года?
3 Ці туберкулёз і алкагалізм можна назваць грамадскай хваробай?
4. Ці ёсць у Польшчы закон для супрацьалкагольнай дзейнасці (калі так, дык у якім годзе ўстаноўлены)?
5. Як найхутчэй можна выявіць туберкулёз?
6. Што павінен рабіць чалавек, калі захварэе туберкулёзам?
7. Чым з'яўляецца масавае абследаванне рэнтгенам і якое яго значэнне?
8. Якія ведаеш прывіўкі ў супрацьтуберкулёзнай прафілактыцы?
9. Якім чынам можна ўстанавіць нецвярозасць?
10. Назавіце арганізацыю, якая займаецца барацьбой з алкагалізмам і туберкулёзам?
11. Што выклікае туберкулёз?
12. Якія ведаеш спосабы супрацьдзеяння туберкулёзу?
13 Да чаго даводзіць алкаголь?
14. Каму з сям'і хворага туберкулёзам найбольш пагражае заражэнне гэтай хваробай?

Адказы дасылайце на адрас: Wojewódzka Przychodnia Przeciwgruźlicza ul. Warszawska 18, skr. poczt. 43, 15-950 Białystok (Instruktor Oświaty Zdrowotnej p. 73).

Тэрмін: да 20 снежня.

Пераможцы атрымаюць рэчавыя ўзнагароды.

ФАЛЬКЛОР

ЛЮБОЎНАЯ



Ой ты, ко – за – чэ, сі – вы го-лу – боч – ку,



СПО – ДО – БАЎ – СЕ МНІЕ, ЙДУ-ЧЫ ПО ВО – ДОЧ – КУ.



СПО – ДО – БАЎ – СЕ МНІЕ, ЙДУ-ЧЫ ПО ВО – ДОЧ – КУ.

Ой ты, козачэ, сівы голубочку,
Сподобаўсе мніе, йдучы по водочку.
Сподобаўсе мніе, йдучы по водочку.
Ой, нэ так по воду, як і з діевчыною,
Сподобаўсе мніе своею ўродою.
Сподобаўсе мніе своею ўродою.
— Ой ты, діеўчыно, сівая голубко,
Ой, сядай, сядай, на мой чолон хутко.
Ой, сядай, сядай, на мой чолон хутко.
Ой, шчэ й діеўчына ў чолон нэ вступіла,
Як вырваласе нэшчасна годіна.
Як вырваласе нэшчасна годіна.
Як рыба-шчука хвостом вывільнула,
То й діевчыноньку з чолна выкінула.
То й діевчыноньку з чолна выкінула.
— Ой, ратуй, ратуй, козачэньку, ратуй,
То будэш міеті од ойца заплату.
То будэш міеті од ойца заплату.
— Ой, лепі буду ў воді потонаті,
Як за козаком горэ-горовати,
Як за козаком горэ-горовати.

Ад Анны Стахвіюк, 1924 года нараджэння, вёска Трасцянка Гайнаўскага павету запісаў 2 жніўня 1973 года Мікалай Гайдук. Нотны запіс з магнетафоннай стужкі зрабіла Людміла Панько.

Песню спявалі на вечарынках пры пражы кудзелі.

ГАЙНАЎСКІЯ АКТЫВІСТЫ БГКТ

Кастусь Ваўрэшук і яго сябры



Кастусь Ваўрэшук прыйшоў у рады БГКТ не так даўно. Малады гэта яшчэ хлапец. Ён сказаў: „Яшчэ будучы ў пачатковай школе, марыў я, што пайду ў беларускі ліцэй, бо толькі там змагу лепш пазнаёміцца з беларускай культурай, гісторыяй народа, лепш вывучыць родную мову. Многа чытаю беларускіх кніжак, а „Ніва" — мая першая газета, яе я чытаю ад пачатковай школы".

Гурток БГКТ у Збучы. Функцыю старшыні члены яго даверылі іменна Косці Ваўрэшуку. Праца добра. „Заслуга ў гэтым, — кажа, — і маіх сяброў і сяброўак — сакратара Кузьмы Сапяжынскага, касіра Зоі Саенка і іншых членаў нашага гуртка. У нас у 100 працэнтах аплочаны складчыны. Згодна з планам працы, арганізуем сустрэчы, гутаркі, робім газеткі, пры дапамозе праўлення аддзела дэманструем беларускія і рускія фільмы. Нядаўна, з выпадку 30 гадавіны ЛВП паказалі мы людзям 2 фільмы. У рады нашай арганізацыі прынялі мы многа маладых. Пастараемся не падвясці і ў песенным конкурсе.

Было б добра, каб многія маладыя члены БГКТ узялі прыклад з моладзі ў Збучы і ў сябе разгарнулі такую дзейнасць. Напэўна ёсць на нашай Гайнаўскай зямлі і іншыя добрыя дзеячы на ніве БГКТ, і пра іх пастараемся напісаць у наступных нумарах „Нівы".

Віктар Бура
сакратар аддзела БГКТ
у Гайнаўцы

Выхаваўчая кара

Прысудныя калегіі рад нарадовых знайшлі цікавае выйсце для п'яных буянаў, якія любяць пускаць у людзей нецэнзурнымі словамі, абражаць іх годнасць, выклікаць скандал. У Беластоку калегія карае іх абавязкам замятання вуліц. А гэтая кара для іх найгоршая. Яны рады былі б заплаціць грошы, а нават адсядзець у арышце, толькі каб не замятаць вуліц. Дык робяць гэта пераважна ноччу, каб не бачылі людзі. Што ж, відаць гэта вельмі выхаваўчая кара.

У Нараўцы прысудная калегія нядаўна таксама засудзіла 5 асоб на падобныя кары. Юрый Панькоўскі (сын Шымона) павінен адпрацаваць сорак гадзін там, дзе вызначыць гміна, Мікалай Кісялеўскі мае адпрацаваць 150 гадзін, бо ён па-п'янаму яшчэ лепш, чым Панькоўскі праявіў у гасподзе сваё „здольнасці". (мх)

Не пякуць хлеба

Пячы хлеб — справа клапатлівая. На вёсцы хлеб пякуць рэдка калі раз у тыдзень. Пераважна — раз на два тыдні, бо і работы з ім многа, і дроў шмат ідзе. Але і радзей пячы хлеб нельга, таму, што ён чарствее ды цвіце, калі доўга паляжыць. Усім гэтым нявыгадам памаленьку прыходзіць канец. Сяляне ўсё больш купляюць хлеб, напечаны ў пякарнях. А ёсць ужо такія вёскі, дзе людзі ўжо адвыклі зусім пячы хлеб. Напрыклад, у Сухавольцах. У мясцовую краму хлеб прывозяць з Кляшчэляў два разы ў тыдзень. У месяц жыхары гэтай вёскі спажываюць 1200 кг хлеба, напечанага ў кляшчэлеўскай пякарні. (мх)



Від на белую капальню.

Барбурка — гэта традыцыйнае гарняцкае свята, якое святкуецца 4 снежня ў дзень Барбары — апякункі гарнякоў. Калі набліжаецца Барбурка, думаем пра людзей Шлёнска, якія дабываюць вугаль. Аднак трэба памятаць, што ў нас, на Беласточчыне ёсць таксама гарнякі: тыя што працуюць у каменяломах і работнікі мельніцкіх капальняў крэйды. Аб іх і пойдзе сёння гутарка.

ДАЎНЕЙ БЫВАЛА

Гісторыя мельніцкай крэйды доўгая. Тутэйшыя людзі гавораць, што ўжо 200 год таму назад капалі тут крэйду. Мельнічане капалі глінку (бо так у ваколіцы называюць крэйду) на сваіх участках зямлі. Прымянялася яна асабліва пры бяленні памяшканняў. У перадсвяточныя дні мельнічане з гамолкамі глінкі выязджалі на кірмаш, дзе прадавалі крэйду, а часта ездзілі і па вёсках. Амаль усе вясковыя хаты маляваліся глінкай.

Аднак слава мельніцкай крэйды ішла далёка. Гістарычныя дакументы сцвярджаюць, што Брэсцкая крэпасць пабудавана на аснове вапны з мельніцкай крэйды. Будаўнічы матэрыял давозіўся з Мельніка да Брэста фурманкай.

Мельніцкія крэйдзяры гавораць, што іх гістарычным пабрацімам была Луплянка. Тут таксама ў мінулым капалі крэйду і прадавалі для бялення хат.

ПАСЛЯ ВАЙНЫ...

...эксплуатацыяй крэйды занялося дзяржаўнае прадпрыемства — Сямяціцкі завод будаўлянай керамікі. Тады была тут толькі адна капальня, што знаходзілася на Бугу (зрэшты, ужо не існуючая). Перапрацоўвалася тут глінка на фармаваную крэйду і гэта ўсё.

Умовы працы былі вельмі прымітыўныя і цяжкія. Выкапаную глінку раскладалі на траве і таптаалі босымі нагамі, вымешваючы яе. Затым яна падсыхала, фармавалася ў пліткі і ў такім стане прадавалася. Яшчэ ў 1954 годзе адзінымі прыладамі працы ў капальні былі: лом, кірка і клін.

Потым наступіла частковая механізацыя. Прыйшлі першыя экскаватары, быў пашыраны асартымент, на што дазволілі пабудаваная сушарня і цэх млыноў.

ЗАРАЗ...

...мельніцкі крэйдавы завод прадукуе поўны асартымент крэйд: молатая малярская крэйда — для малявання памяшканняў; кармавая крэйда — як дадатак да корму жывёле; т. зв. шламованая крэйда для хімічнай прамысловасці — як дадатак да прадукцыі плітак PCV, да прадукцыі гумы, фарб і г.д. Апрача таго, Мельнік прадукуе тэхнічную крэйду для прадукцыі кіту і фармаваную крэйду. Для сельскай гаспадаркі вырабляецца тут крэйда для адквашання палёў і лугоў. У апошні час уведзен у прадукцыю новы гатунак школьнай крэйды. Тэхналогія крэйды такая, што мельніцкая крэйда заўсёды піша на дошцы.

Мельніцкі крэйдавы завод і цяпер мае ўстарэлы, мала эканамічны тэхналагічны працэс прадукцыі, аднак ужо ў гэтым годзе распачалася мадэрнізацыя. За 6 мільёнаў зл. будзе пабудаваны сучасны цэх, цалкам механізаваны. Самаход з крэйдай пад'едзе і высыпле яе з аднаго боку, а з другога боку цэха будуць выходзіць ужо мяшкі са зважанай крэйдай.

У самой капальні праца ўжо цяпер упаўне механізавана, аб чым можа сведчыць толькі 13 чалавек, працуючых у капальні. Цяжкія экскаватары і бульдозеры замянілі цяжкую працу людзей.

Частка сыравіны перарабляецца на месцы ў Мельніку, частка — на недалёкім заводзе на станцыі Сямяцічы, а частка высылаецца вагонамі ў розныя куткі Польшчы: у Гуціска к/Кракава, у Познань і Старалэнку. Вываз мельніцкай сыравіны не эканамічны. Паколькі гэта крэйда мае 25 працэнтаў вады, то атрымліваецца, што кожны чацвёрты вагон гэта пераважаная вада. Аднак мадэрнізацыя і развіццё завода ліквідуюць і гэты недахоп.

З заводам зжылося многа сем'яў. У завадскім калектыве вядомыя прозвішчы Усовічаў, якія працуюць ужо тры пакаленні, сям'я Кас'янюкоў і іншыя.

Завод — гэта не толькі месца працы для людзей. Завод уключыўся ў грамадскія працы на карысць усіх жыхароў Мельніка. Сваімі машынамі дапамагае пры перабудове вуліц, зрабіў выкапы пад фундамент цэнтра здароўя, прызначыў 780 тысяч злотых на пабудову водаправода.

З нагоды Барбуркі 145-асабоваму калектыву мельніцкага крэйдавага завода жадаем поспехаў.

А. Карпюк
фота аўтара



Так пакуль што важаць крэйду ў Мельніку.



Разбураны мельніцкі замак.

Куток практычных ведаў



ПЕРАД СВЯТОЧНЫМІ ПАРАДКАМІ

Зімовыя святы не за гарамі. Так што найбліжэйшыя тыдні варта прысвяціць парадкаванню ў хаце, з тым, каб пазней мець вольны час на падрыхтоўку смачных святочных патраў.

Нельга забывацца, што пры парадках у хаце вельмі дапамогуць вам розныя хімічныя прэпараты, дзякуючы якім праца гэта не будзе вельмі цяжкой і ісці будзе хутка і спраўна.

Для чышчэння шыб, люстраў і розных шкляных шафак прызначаны вадкасці „Ewa", „Silux", „Kryształ" і „Solidol".

Дываны, кілімы, мяккую мэблю чысцім прэпаратамі: „Pers", „Pianka", „Dywanol".

Для мыцця санітарнага абсталявання (ванны, ракавіны, ракавіны ў прыбіральнях) служаць парашкі „Jawox", „Radix", „Czyścik", „Wowo", „Luxon", пасты „Dom", „Luxon", „Alum" і вадкасць „Skrzat".

Для чышчэння металу — нікеліраваных рурак, кранаў, клямак і г.д., найлепш падыходзяць крэмы „Neosidol" і „Sidoral" і вадкасць „Ewa".

Для мыцця кухоннага і сталовага посуду, а таксама прадметаў са штучнага рэчыва і розных лакіраваных паверхняў ды глазуры служаць вадкасці „Tiptop", „Kuchcik", „Ludwik", „Skrzat" і парашок „Jawox".

Для шаравання кухоннага посуду падыходзяць найбольш парашкі „Jawox", „Radix", „Czyścik", „Luxon", „Wowo", „Skrzat" і пасты „Alum", „Luxon", „Dom".

Аконныя рамы, дзверы, шафкі і розныя прадметы, памаляваныя алейнай фарбай, найлепш мыць парашком „Ixi". Толькі трэба памятаць, што раствор павінен быць намнога слабейшы, чым для мыцця бялізны. Можна мыць таксама парашкамі і вадкасцю, прызначанымі для мыцця посуду, хаця б папулярным „Людвікам". Нельга аднак ужываць для гэтай мэты звычайных парашкоў для мыцця бялізны, паколькі фарба будзе жаўцець і адпрысквацца.

І яшчэ адно. Якраз цяпер, у перыяд інтэнсіўнай падрыхтоўкі да свят і парадкавання ў хаце, варта памятаць, што прымяненне гэтых розных паст, вадкасцей і парашкоў для прання і чышчэння высушае скуру рук. Таму нельга забывацца аб тым, што разам з гэтым неабходна прымяняць спецыяльныя крэмы для рук. Так што, купляючы парашкі ў хімічным магазіне, варта адразу ж зайсці ў драгерыю і купіць крэм „Silikonowy", „Owocowy", „Uroda" або які іншы для рук. Крэм гэты неабходна ўціраць у рукі перад тым, як збіраемся іх доўга мачыць у розных хімічных прэпаратах, а таксама штодзень нанач, нягледзячы на тое, якую працу будзем выконваць ўдзень.

Гаспадыня



— Правядзенне сустрэч з калегамі, ці „выхад на сувязь", як мы, прафесіяналы, гаворым, — зазначае Блейк, — заўсёды адзін з самых небяспечных момантаў у рабоце разведчыка. Любы, нават вельмі старанна падрыхтаваны выхад на сувязь нясе ў сабе патэнцыяльную рызыку. А часам жа неабходна прырашэнне адразу ж, на месцы...

Так было і тады, у 1953 годзе... Ужо на падыходзе да абумоўленага месца вопытны позірк заўважыў паліцэйскую машыну, падазроных людзей на вуглу. Што такое? Павярнуць назад? Адмовіцца ад сустрэчы? А што падумаюць таварышы? Яны ж будуць хвалявацца, не ведаючы, што здарылася. Але ўсё абышлося добра. Блейку ўдалося ўстанавіць, што паліцыя шукае крымінальнага злачынцу. Важная сустрэча адбылася.

— У Сікрэт інтэліджэнс сервіс і ў ЦРУ, — усміхаецца Блейк, — многія зрабілі сабе кар'еру на гэтым праслаўленым тунелі. Разведка сабрала тут такую колькасць „інфармацыі", што спатрэбіўся вялікі апарат спецыялістаў для яе апрацоўкі...

Пасля работы ў Лондане Блейк накіроўваецца ў рэзідэнтуру СІС у Заходні Берлін, Блейк працуе там некалькі гадоў і ўваходзіць у важную групу супрацоўнікаў Інтэліджэнс сервіс, якая непасрэдна займаецца работай супраць Савецкага Саюза.

— Ці не маглі б вы, Джордж, у сувязі з гэтым прывесці некалькі прыкладаў падрыўной дзейнасці англійскай разведкі супраць Савецкага Саюза, іншых сацыялістычных краін і іх грамадзян?

— Ахвотна. Большая частка дзейнасці СІС накіравана супраць Савецкага Саюза і сацыялістычных краін.

Расказваць аб арганізацыі работы англійскай разведкі супраць СССР можна вельмі шмат. У 1955 годзе, напрыклад, пасля нарады ў СІС было створана спецыяльнае падраздзяленне „Руская апаратыўная секцыя". У яе задачы ўваходзіла ўзмоцніць работу супраць савецкіх грамадзян, якія знаходзяцца за граніцай, у тым ліку ў Лондане, закідваць агентуру на тэрыторыю СССР, актывізаваць мерапрыемствы супраць дыпламатычных і іншых прадстаўніцтваў СССР за рубяжом.

Магчыма, пра гэта яшчэ давядзецца гаварыць, але вось цяпер я ўспомню адну аперацыю СІС у Заходнім Берліне. Гэты горад з самага пачатку разглядаўся ў колах англійскіх і амерыканскіх разведак як фарпост шпіёнскай дзейнасці супраць рускіх. І вось СІС арганізавала непадалёк ад граніцы савецкага сектара спецыяльны магазін. На думку англійскай разведкі, гэта крама павінна была выкарыстоўвацца для ўстанаўлення кантактаў з савецкімі людзьмі, для ўцягнення іх у розныя камерцыйныя здзелкі і як вынік — вярбоўка. Гаспадаром магазіна з'яўляўся агент англійскай разведкі, немец па паходжанню. Прадугледжвалася, што як толькі ў магазіне з'явіцца першы рускі, яго неабходна пераканаць зрабіць заказы на дэфіцытныя тавары і дамовіцца, каб ён прыйшоў яшчэ. Больш таго, магазін прадстаўляе пакупніку поўныя льготы. У зручны момант рускага заказчыка, прыдумаўшы пэўную прычыну, павінны пазнаёміць з прадстаўніком брытанскай разведкі, які і зоймецца яго далейшай апрацоўкай.

Раскажу пра адзін цікавы выпадак, які звязан з гэтым магазінам. Неяк днём, у час дзяжурства па рэзідэнтуры СІС, я атрымаў умоўны сігнал ад гаспадара магазіна: „З'явілася руская". У магазін давялося выехаць мне. Там я і павінен быў увайсці ў кантакт з пакупніцай. З першых мінут гэты кантакт развіваўся вельмі лёгка і проста. Жанчына назвала сябе Нінай, заявіла, што яна працуе інспектарам на камутатары штаб-кватэры савецкіх войск у Карлсхорсце, і праявіла недвухсэнсоўную зацікаўленасць у працягу кантакту са мной. Далейшая, больш старанная праверка паказала, што Ніна зусім не з'яўляецца Нінай, што яна ніякая не руская, а працуе ў Заходнім Берліне ў аднаго амерыканца — супрацоўніка Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення... Ну, а што датычыць магазіна, то яго давялося праз некаторы час закрыць, як „вельмі нерэнтабельны пункт". Вам, відаць, зразумела чаму? Разам з тым, дадаў Блейк, — мне не хацелася б, каб у вас склалася няправільнае разуменне аб узаемаадносінах СІС і ЦРУ.

Аб тым, што спецыяльныя службы імперыялістычных дзяржаў у той ці іншай ступені каардынуюць сваю дзейнасць і нават праводзяць сумесныя аперацыі, накіраваныя супраць Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін, супраць міжнароднага камуністычнага руху, супраць прагрэсіўных арганізацый, вядома. Вялікую цікавасць, на маю думку, мае пытанне аб тым, якую работу разведкі заходніх дзяржаў вядуць адна супраць адной. Так, напрыклад, англійская разведка пастаянна займаецца актыўным вывучэннем французскіх разведвальных і контрразведвальных службаў. У Заходнім Берліне рэзідэнтура СІС складала падрабязныя характарыстыкі і мела картатэку на работнікаў французскіх разведвальных і контрразведвальных службаў. Вялося іх актыўнае вывучэнне з мэтай устанавіць, хто з іх мог быць выкарыстаны СІС.

(Заканчэнне ў наступным нумары)

ТРЫБУНА чытачоў

„Працавітыя"

У Плёсках у магазіне вельмі працавітыя прадаўшчыкі. Працуюць яны кожны дзень ад 6 раніцы да 6 вечара. Нават у нядзелю, калі ёсць піва, адкрываюць. У нядзелю я была ў вёсцы і пачула, што адкрыты магазін. „Ну, калі магазін адкрыты, — думаю, — зайду, ды куплю патрэбнае".

Зайшла ў сярэдзіну і ўбачыла адных мужчын, а за прылаўкам стаяла маладая прадаўшчыца. Калі папрасіла я тавар, яна сказала, што прадае толькі піва, а іншых тавараў у нядзелю ніхто не купляе. Дык навошта адкрываць у нядзелю магазін, калі апрача піва, нічога не прадаецца? Відаць, на піве прадаўшчыкі многа зарабляюць. Чула я, што магазін адкрываюць нават уначы, калі хто хоча купіць піва.

„Кліентка"

Парцава

Вёска Парцава Бельскага павету ляжыць у пяці кіламетрах ад Бельска Падляшскага. Ваколіца гэтай вёскі прыгожая. Кругом палі, лугі. За апошнія гады вёска многа папрыгажэла. Пастаўлена тут многа новых дамоў, хлявоў, клуняў. На дамах відаць тэлевізійныя антэны. Гэта сведчыць аб тым, што жыхары Парцава вольны час любяць праводзіць ля экранаў тэлевізара, цікавяцца падзеямі не толькі ў Польшчы, але ва ўсім свеце.

У Парцаве цяпер новая злеўня малака. Змяшчаецца яна ў прыгожым мураваным будынку. Побач злеўні знаходзіцца крама. У ёй можна купіць прадуктовыя і прамысловыя тавары. У Парцаве ёсць пачатковая школа, у якую ходзяць дзеці з трох вёсак: Парцава, Вулькі і Спічкаў.

Сусед Толік



МАЕЙ МАМЕ

Мама, мама мая дарагая,
Ты не сярдуй на мяне,
Мама, мама мая залатая,
Ведай, люблю я цябе.

Памагаю ў рабоце табе
І памагаць табе мушу,
Не шкадую ніколі сябе,
Аддала б за цябе сваю душу.

Калі я са школы вяртаюся,
З усмешкай вітаеш мяне,
Хутчэй пра ацэнкі пытаешся —
Ці добрыя яны, ці не?

Мама, найдаражэйшая,
Няхай табе сонца свеціць!
Любімая і наймілейшая,
Няхай цябе кахаюць дзеці!

Жэня Аўсенюк,
Бельскі эканамічны ліцэй

СОН

Сёння заблудзіла я
і папала —
о, дзіва —
у краіну,
аб якой
даўно ўжо марыла,
У гэтай краіне
заўсёды вясна,
весела шумяць
зялёныя бары,
птушкі спяваюць
аб шчасці.
А людзі?
людзі з усмешкай
на тварах
працуюць.
Тут ніхто
не чуў стрэлаў,
ніхто не бачыў
крыві.
Чужы ім гук
і выбух бомб.
Гэтыя людзі
не знаюць слова —
вайна.
Яны працуюць
рука ў руку.
Я бачыла, як
трох маладых братоў —
Белы, Чорны, і Жоўты —
будавалі
супольны дом.
Мне захацелася ім памагчы
але я не паспела...

Ніна Матысюк,
Гайнаўскі беларускі ліцэй

У бельскай чытальні

Люцына Гардзеюк працуе ў павятовай бібліятэцы ў Бельску. На работу ў гэтай бібліятэцы паступіла яна пасля заканчэння навукі ў Бельскім беларускім ліцэі.

Зараз яна працуе ў чытальні гэтай бібліятэкі. Тут даволі вялікі рух. Прыходзяць сюды даяджаючыя вучні, якія хочуць карысна правесці час да ад'езду цягніка ці аўтобуса. Вучні карыстаюцца кнігамі, каб папоўніць веды, атрыманыя ў школе. Прыходзяць таксама студэнты.

Адразу ад дзвярэй вітае іх ветлівая ўсмешка Люцыны Гардзеюк. Яна ўмее параіць, якую кніжку найлепш пачытаць, умее стварыць свабодны і добры настрой у чытальнай зале. Умее „проста з-пад зямлі" дастаць неабходныя кніжкі і матэрыялы.

Наша бібліятэкарка — ветлівы і вясёлы чалавек. Добра, што ёсць у нас такія людзі.

М. Інфармацкі



Дарагое „Сэрцайка"!

Я ўжо немаладая. Мне 28 гадоў. Ды і маладосць мая была нялёгкая. Калі мне было 15 гадоў, памерла мая мама. Асталося нас трое дзяцей. Я была найстарэйшай і мне прыпала роля гаспадыні. Праз тры гады бацька ажаніўся. Мне ўжо тады споўнілася 18 гадоў. Я пастанавіла пайсці ў горад на работу. Нялёгка было знайсці працу, бо закончыла я толькі сем класаў. Працавала фізічнай работніцай і вучылася ў вячэрнім тэхнікуме. Складаючы грош да граша, я назбірала грошай на кватэру ў жыллёвым кааператыве. Цяпер ужо ўсе гэтыя клопаты за мной. Я жыву ў прыгожай кватэры. Па прафесіі я ўжо тэхнік і маю добрую работу. Пасля работы весела праводжу час, бо ёсць у мяне шмат сяброўак. Але да хлопцаў нейк шчасця не маю. Пазнаёмілася з адным, аднак хадзіла з ім нядоўга. Часта прыходзіў п'яны, няраз і міліцыя ім займалася, бо любіў па-п'янаму пахуліганіць, сяго-таго зачапіць. Паглядзела я на гэта і пастанавіла кінуць яго, хоць праўду кажучы, падабаўся ён мне. Але рассудак перамог. А вось і наступная мая гісторыя. Пару месяцаў таму назад на вечарынцы я пазнаёмілася з Алёшам. Час ад часу ён мяне наведваў. Многа аб сабе гаварыў. Хваліўся, што бацькі яго маюць добрую гаспадарку і што ён у іх адзін, але не захацеў працаваць на гаспадарцы і пераехаў у горад на лягчэйшы хлеб. Працу змяніў ужо некалькі разоў, бо не адпавядала, шукае ўсё нейкай лепшай. Калі ідзем у кіно ці ў кавярню, дык пераважна я за ўсё плачу, а ён абяцае, што ў даўгу не астанецца, хай толькі ўладкуецца на добрую работу. Я яму спачувала, мне ж таксама спачатку нялёгка было. Але вось аднойчы ён убачыў маю ашчадную кніжку. Пасля таго штораз гаварыў, што хацеў бы са мной ажаніцца. Толькі матэрыяльна яму цяжка. Прасіў, каб я яму пазычыла пару тысяч, ён купіць сабе добрае адзенне, тады паедзем да бацькоў, ну, і падамо на запісы. Я аднак не згадзілася. Але, можа, і дрэнна зрабіла, бо Алёша ўжо больш да мяне не прыйшоў. Я ўжо сама не ведаю, ці гэта такія хлопцы трапляюцца, ці мо я сама дрэнна паступаю? Як ты, „Сэрцайка", гэта асудзіш?

Зіна з Беластока

Зіна! Паступаеш ты вельмі разумна. Добра зрабіла, што пагнала ад сябе аднаго гультая, ды і другога не шкадуй. Відаць, Алёша нідзе месца не нагрэе, ні на вёсцы, ні ў горадзе. Калі чалавеку працаваць не хочацца, яму ўсюды будзе дрэнна. А твае гатовенькія грошы яму запахлі. Калі іх не дастаў, дык і не з'явіўся больш. Цешся, што так сталася, што пазбылася абібока і не нарабіла сабе клопатаў. Ды не перажывай! Не ўсе хлопцы дрэнныя. Напэўна спаткаеш яшчэ парадачнага чалавека. Лепш выйсці замуж пазней, але добра, чымсьці рана абы-як.

„Сэрцайка"

Скуль дым ідзе, адкуль гарэлым пахне?

Стаялі сабе Лена і Віктар Бура а дзесятай гадзіне раніцы 1 лістапада на панадворку, калі раптам пачулі дзіцячыя крыкі. Бачаць, што гэта малыя Агатка і Эля Сталбоўскія перад домам лямантуюць, а са шчыта хаты валіць дым. Вядома, гарыць. Адразу бягом.

Віктар, мужчына, плячом у дзверы і ў хату. Па пакоі бабка старэнькая мітусіцца. Жменю грошай за пазуху ўпіхнула, дым яе душыць, а яна круціцца, што рабіць, сама не ведае. Людзей ужо шмат збеглася. Добраахвотнікі з пажарнай аховы таксама ўжо тут. Выносяць з хаты хто што. Віктар, бабку на двор выпіхнуўшы, за халадзільнік ухапіўся. Глядзіць, а тая назад ужо ўлезла, закашлялася, чуць не самлела. Прышлося яе ў першую чаргу выносіць.

Нягледзячы на тое, што гаспадароў не было дома, то дзякуючы дружнай дапамозе суседзяў і пажарнікаў не толькі што хата не згарэла, а нават рэчы амаль усе выратавалі. Пацярпела толькі Лена Бура. Мужа шукаючы, хацела ў хату заглянуць, ды не маючы чым, рукою шыбу выбіла — у такіх выпадках рэч звычайная. Што ж, калі руку сшываць трэба было і сёння яна на гіпсавай шыне.

Якая прычына пажару?

Пажарнікі кажуць, што проста печка з комінам была злучана толькі бляшанай трубою, абкручанай анучамі і аблепленай глінай. Усё гэта было абабіта пільснёвай пліткай і абоямі абклеена. Ну і якое дзіва, што загарэлася?

Перагляньце таму, даражэнькія, свае печкі ды коміны перад зімою. Калі „чырвоны певень" на вашу жэрдку сядзе, тады ўжо позна будзе. А пажарнай ахове з цэлага сэрца жадаем „агня ў меру — больш вады".

Ларс

Гмінная нарада апекуноў ЗГП

Гарцэрская і зуховая арганізацыі гуртуюць вялікую колькасць моладзі пачатковых школ. Настаўнікі, якія вядуць заняткі ў гэтых арганізацыях, складаюць прысягу, як салдаты, што будуць працаваць сумленна на карысць краіны ў выхаванні маладога пакалення.

19 кастрычніка ў Міхалове адбылася гмінная нарада апекуноў гэтых арганізацый, якую вёў гмінны камендант ЗГП Янка Сянкевіч. Удзел прыняў таксама камендант гуфца на Беластоцкі павет Яўген Зіневіч. Сярод прысутных 21 настаўнікаў, прысягу складала 10 чалавек. Усе іншыя — ужо працавалі па некалькі год. Прысутныя пазнаёміліся з гадавым планам працы. У дыскусіі прынялі ўдзел Станіслаў Гаеўскі — гаварыў аб спорце гарцэраў, Ірэна Курыла — аб арганізаванні супольнай ёлкі гарцэрамі гміны і аб дапамозе гарцэраў зухам, і многа іншых спраў выйшла ў гэтай дыскусіі.

Выбрана было 8 дэлегатаў на павятовы з'езд ЗГП, які адбудзецца ў канцы лістапада 1973 года. Варта адзначыць, што адным з дэлегатаў гэтага раёна будзе камендант павятовага гуфца грам. Яўген Зіневіч.

Гарцэры з Міхалова ўручылі каменданту кветкі і рапартавалі аб сваёй працы.

Мікола Краўчук,
Патока

Не даюць спаць

Лапухоўка — гэта вёска невялікая, але ў нядзелю вечарам на вуліцы Лапухоўкі вы ўбачыце многа дзяўчат і хлопцаў гадоў 12—15.

Гэтыя дзяўчаты з Катлоўкі і Кавелы, а хлопцы з Лапухоўкі. Яны ўсю ноч валочацца па закамарках вёскі і не даюць людзям спаць.

Васіль Врона

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Справа механіка з Кляшчэляў

Адказвае:

Urząd Gminy w Kleszczelach pow. hajnowski.

W odpowiedzi na notę pt. „Taki on mechanik", oraz Wasze pismo w sprawie naprawy pojazdów mechanicznych przez Ob. Wojciecha Grenia zam. w Kleszczelach, Urząd Gminy wyjaśnia jak niżej:

Ob. Greń Wojciech jest zatrudniony w Państwowym Ośrodku Maszynowym w Kleszczelach na stanowisku mechanika ciągnikowego i prywatnego zakładu naprawczego nie prowadzi.

Po zbadaniu jednak sprawy na miejscu przy udziale funkcjonariuszy MO stwierdzono, iż zarzut stawiany jemu przez Waszego Korespondenta okazał się słuszny i Ob. Greń Wojciech rzeczywiście zreperował motocykl, za który pobrał wynagrodzenie takie, jakie uważał za słuszne, tym bardziej, iż jak z oświadczenia wynika, motocykl zreperował dobrze. Fakt, iż Ob. Greń Wojciech dyktuje wysokie ceny nie upoważnia nas do interwencji w tej sprawie ze względu na to, iż nie prowadzi on zakładu prawnie i nie zmusza nikogo do przyprowadzania pojazdów do remontu.

Jednocześnie w myśl przepisów prawa, każdy kto bez pozwolenia świadczy usługi, podlega karze. Takowy też wniosek został sporządzony i przesłany do Kolegium karno-administracyjnego w Hajnówce celem ukarania.

Naczelnik Gminy
(—) Andrzej Misiejuk

ЧЫТАЙЦЕ і РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ „Ніву"!

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Белавежа
„Dzikie dziecko" (franc.), 4—5. „Tajemnica Aleksandra Dumasa" (CSRS), 6—7. „Tylko wtedy, gdy się śmieję" (angl.), 8—9.

Чаромуха
„Dzikie dziecko" (franc.), 4—5. „Trup w każdej szafie" (angl.), 6—7. „Jesteś już meżczyzną" (USA), 8—9.

Кляшчэлі
„Siedemnasty równoleżnik" (franc.), 4—5. „Wkrótce będzie koniec świata" (jugosł.), 6—7. „Fraulein doktor" (jugosł.), 8—9.

Нараўка
„Zabijcie czarną owcę" (polski). „Naszyjnik dla mojej ukochanej" (radz.), 5—9.

Нарва
„Niech bestia zdycha" (franc.), „Jezioro osobliwości" (polski), 5—9.

Чыжы
„Morderca samotnych kobiet" (NRD), „Tylko wtedy, gdy się śmieję" (angl.), 5—9.

Дубічы Царкоўныя
„Staroświecki dramat" (radz.), „Brylanty pani Zuzy" (polski" 5—9.

Арэшкава
„Wakacje we czworo" (włoski), „Wrzesień 1939" (polski), 8—9.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Орля
„Zaproszona" (franc.), „Ślub bez obrączki" (czeski), 5—9.

Райск
„Nie lubię poniedziałku" (polski), „Czarownica z bagien" (radz.), 5—9.

БЕЛАСТОЦКІ ПАВЕТ

Міхалова
„Na krawędzi" (polski), 8—9.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

„Ujarzmienie ognia" (radz.), I i II s. 4—5. „ W cieniu gilotyny" (CSRS), 6—7. „Rewizja osobista" (polski), 8—9.

Шудзялава
„Oskarżeni o zabójstwo" (radz.), „Pokój przechodni" (NRD), 5—9.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ


Нурэц
„10 dni bezpłatnego urlopu" (bułg.), 4—5. „Smic, smac, smoc" (franc.), 6—7. „Ciepło twoich rąk" (radz.), 8—9.

Мілейчыцы
„Dziki i swobodny" (angl.) 4—5. „Nie ma powrotu Johny" (polski), 6—7. „Gracz" (radz.), 8—9.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicysci 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł, półrocznie: 14,40 zł. kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch", Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40 proc. Nr indeksu 36911.

BZGraf. Nakład 7.669 K-3



— *Заўсёды скардзіўся, што яго стол завалены справамі!...*

НЕ ПРАБЛЕМА

Аднаму адвакату ўдалося выцягнуць свайго падабароннага з даволі бруднай справы.

— Ах, пан адвакат, я не ведаю, як выказаць вам сваю ўдзячнасць.

— Дарагі мой, з таго часу як чалавецтва вынайшла грошы, гэта не праблема.

ЧАМУ?

У рэстаране афіцыянт накрывае стол для банкета. Метрдатэль, які праходзіў міма, спыняецца і здзіўлена пытае яго:

— Паслухай, чаму гэта ў цябе адлегласць паміж прыборамі па два метры?

— Дык банкет жа наладжвае клуб рыбаловаў...

ПАШАНЦАВАЛА


Тэхаская дама гаворыць сваёй знаёмай:

— Майму беднаму мужу ўсё жыццё не шанцавала, яму пашанцавала толькі пасля смерці.


— Як пасля смерці?

— Калі яму капалі магілу, натрапілі на нафту.

ЧАГО Ў СПОРЦЕ НЕ БЫВАЕ!



— *Будзеш выплёўваць зубы, дык памятай, што нас паказваюць па тэлевізару.*



Сябра!

Падпіска на

«Ніўку»

прымаецца

не тут,


а ў любой

паштовай

установе.

ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ!

Калі вы хочаце рэгулярна чытаць «Ніву», рэкамендуем аформіць гадавую падпіску. Цана: 28 зл 80 гр.





Экіпіроўка паляўнічага на дзіка.

МІНІБАЙКІ

НАРАЧОНАЯ

— Ты для мяне выскачыш з пятага паверху? — спытала мяне нарачоная.

— Выскачу.

Пайшоў і выскачыў.

— А каня на скаку затрымаеш?

Паехаў у вёску і затрымаў.

— А хуліганаў у міліцыю даставіш?

Адшукаў некалькі хуліганаў. Даставіў.

— Ну, цяпер выйдзеш за мяне замуж? — спытаў я.

— Не, — уздыхнула нарачоная, — вельмі ўжо ты паслужлівы. За Гарохава выйду. Я для яго з дзесятага паверху скакала.

Леў Карсунскі

МІНІВЕРШЫ

АБАРОНЦА ЗАКОНУ

Падпіўшы дбае пра закон,
Аж шыбы сыплюцца з акон,
А пераспіць — і ўсю віну
Прыпіша піву і віну.

Іван Белы

ЗНАХОДЛІВЫ

Ён вынаходніцтвам
здзівіць усіх раз думаў,
Не атрымалася — сказаў:
— А я раздумаў.

Іван Бычанкоў


СТАМІЛАСЯ

Доктар наклаў гіпс на зламаную нагу старой Марце і папярэдзіў яе, каб яна не хадзіла па лесвіцы, пакуль не будзе зняты гіпс.

Праз тры тыдні Марта спытала, калі яна зноў зможа карыстацца лесвіцай.

— А хіба вам так ужо неабходна хадзіць па лесвіцы?

— Разумееце, доктар, за гэтыя тры тыдні я проста стамілася лазіць па вадасцёкавай трубе, — сказала старая Марта.



Аўтамат да запальвання.

...Ён можа ўзяць любую перашкоду, каб паставіць сябе перад другім.

...Парася абурылася, што яго назвалі свіннёй.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

По просьбе Ірыны Рабчук з Вроцлава змяшчаем папулярную песню

Słowa: Janusz Kondratowicz
Muzyka: P. Figiel, U. Sipińska

To był świat w zupełnie starym stylu

Szukałam ciebie długo, pogubiłam dni,
a kiedy cię znalazłam, to nie byłeś ty,
wyjęłam z dna szuflady album z dawnych lat
i weszłam w świat, w nasz świat z seansu w starym iluzjonie.

To był świat
w zupełnie starym stylu,
to był świat
zza szyb automobilu.
Śmieszny świat,
pasjanse, potem koncert,
w świetle świec
ktoś grał na klawikordzie.
Śpiewał walc
w karnecie zapisany
ty i ja,
znów w sobie zakochani.
Szalał bal
aż do białego świtu,
to był świat
w zupełnie starym stylu.

A gdy ucichły struny, zgasły iskry świec,
otwartym oknem nagle wpadł słoneczny dzień,
na dno szuflady wrócił album z dawnych lat
i zamknął się nasz świat z seansu w starym iluzjonie.

To był świat
w zupełnie starym stylu,
to był świat
zza szyb automobilu.
Śmieszny świat,
wyścigi na Dynasach,
ty i ja,
znów razem na wywczasach.
Potem film
z Rudolfem Valentino,
pierwszy raz
szumiało w głowie wino.
Tyle lat
przebiegłam w parę minut,
to był świat
naprawdę w starym stylu.
To był świat
w zupełnie starym stylu...



ПАНЫ Ў ПЕКЛЕ

Едзе бедны мужык дарогаю, а пан едзе шасцёркай коней. І пытаецца ў яго:

— А адкуль ты, чалавеча?

А ён кажа:

— З таго свету.

— А што нашы бацькі там робяць?

— А што ж, вяльможны пане! Панам усюды добра: у катлах сядзяць, люлькі кураць, а бедны мужык дровы рубае і пад іх падкладае!

ПЛАДЫ ВЫХАВАННЯ

Вось жа комікі гэтыя дзеці! І чаго яны толькі не прыдумаюць! Асабліва калі адны. І калі няма чым заняцца.

Бацькі Светы і Валеркі пайшлі да знаёмых на імяніны. Дзецям сумна, і малодшы Валерка, нарэшце, не вытрымлівае:

— Давай у што-небудзь згуляем!

— У што? — пытае Светка. — У магазін — гулялі, у школу — гулялі, у хованкі — таксама...

Дзеці на хвіліну задумваюцца. Першай здагадваецца Светка:

— Я буду гаспадыняй. А ты ідзі на работу.

Валерка выйшаў у другі пакой. Праз хвіліну дзверы пакою адчыняюцца і заходзіць Валерка. Ён глядзіць, чым займаецца Светка.

— Хіба ж так тата прыходзіць? — незадаволена гаворыць сястра. — Ён павінен дзвярыма грымнуць.

Валерка ўрываецца ў пакой другі раз менавіта так.

Не зірнуўшы на Светку, падыходзіць да тэлевізара і садзіцца ў мяккае крэсла.

— Зноў налізаўся, — бурчыць пад нос Светка, як гэта звычайна робіць маці.

— Светка! — праз хвіліну, забыўшыся, гукае Валерка.

Але сястра папраўляе:

— Не Светка, а „жонка“ або „старая“!

— Старая! — яшчэ званчэй крычыць Валерка. — Штосьці кепска мне. Прынясі квасу.

— А смалы не хочаш? — бурчыць Светка. — Дзе я табе ноччу таго квасу дастану? На, хіба, марынаваных агуркоў.

— Квасу прасіў, а ты што прынесла? — крычыць што ёсць сілы Валерка і кідае талерку вобземлю.

— Што ты робіш?! — першай апамяталася Светка. — Ты ведаеш, што будзе, калі бацьку не будзе чаго біць?!

— Я — бацька! — крычыць Валерка, увайшоўшы ў ролю. — Не трэба мне тваіх агуркоў марынаваных. Квас падавай!

— А можа гэта з'ясі? — прыносіць Светка памідоры ў жалезнай місцы. — Як рукой здыме.

— Я табе галаву здыму! — крычыць Валерка і шпурляе памідоры.

Светка, нарэшце, прыносіць шклянку вады.

— На табе і квас.

— Вось бачыш! — радасна гаворыць Валерка. — Усё знойдзеш, калі захочаш.

Раптам расчыняюцца дзверы і заходзяць бацькі. Маці хвіліну маўчыць, потым пытае:

— Што ў вас такое адбываецца?

— Нічога, — гаворыць Светка. — Проста мы гулялі...

Бацька, нібы нічога не заўважыўшы, накіроўваецца на сваё любімае месца і крычыць на Валерку:

— Пайшоў прэч!

Уключыўшы на поўную магутнасць тэлевізар, гукае жонку:

— Старая! Штосьці кепска мне. Прынясі квасу!

Гульня закончылася. Пачалося жыццё...

Расціслаў Бензярук



ЗАБАРОНЕНЫ ПЛОД БОЛЬШ САЛОДКІ

Напэўна, нездарма тытунёвая фабрыка ў галандскім горадзе Дордрэхце выпусціла ў продаж новую марку цыгарэт. Рэклама сцвярджае, быццам зроблена гэта для таго, каб людзі „курылі разумна і ўмерана“. Цыгарэты называюцца „Мемор“ (ад лацінскай „мемента моры“ — памятай пра смерць). Надпіс на этыкетцы з малюнкам чэрапа гаворыць: „Шкодна курыць цыгарэты, ужываць алкагольныя напіткі і прымаць наркотыкі. Ідзі на магілкі з „Мемор“ і захапляйся дымам з цыгарэт“.

Псіхалагічны разлік аказаўся правільным — „мемор“ карыстаецца ў галандскіх курыльшчыкаў вялікім поспехам.


ЯШЧЭ АДЗІН „РЭКОРД“

„Самая доўгая карціна свету“ створана ў мястэчку Бад-Мюнстэрайфель (ФРГ). На працягу тыдня 1.000 мастакоў-аматараў размалявалі фарбамі ўчастак дарогі даўжынёю 700 метраў. Для стварэння „карціны“ запатрабавалася 125 кілаграмаў фарбы.

СПАЧАТКУ ЗАПЛАЦІЦЕ...

Пажарная машына, якая на велізарнай скорасці ляцела на тушэнне палаючага дома паблізу іспанскага горада Барселоны была раптоўна спынена на шашы, уладальнікі якой запатрабавалі ад пажарнікаў заплаціць таксу за праезд.

Пажарнікі не ведалі, што яны ўз'ехалі на прыватную шашу. Акрамя таго, у іх не было з сабой неабходнай сумы грошай. Пакуль брандмайстар спрачаўся з уласнікамі шашы, пажар зрабіў сваю справу.



Чым менш выконваюцца загады, тым больш іх пішуць.